УДК 141.4

***В.К. Барэцкая,***
*выкладчык кафедры філасофіі і сацыялогіі ГДТУ ім. П.В. Сухога*

# СУАДНОСІНЫ ХРЫСЦІЯНСКАГА УНІВЕРСАЛІЗМУ І НАЦЫЯНАЛЬНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ Ў СВЯТЛЕ СУЧАСНЫХ САЦЫЯЛЬНЫХ ВУЧЭННЯЎ КАТАЛІЦТВА І ПРАВАСЛАЎЯ

У сучасных сацыяльных вучэннях праваслаўя і каталіцызму вялікая ўвага надаецца праблематыцы суадносін хрысціянскага універсалізму і нацыянальнага самавызначэння. Адмысловае значэнне ў нацыянальнай ідэнтыфікацыі мае самавызначэнне ў культурнай прасторы, якое ўтрымлівае ў сабе менталітэт, традыцыі, рэлігійныя і этычныя нормы і каштоўнасці, а таксама фарміраванне падання аб суверэннай дзяржаўнасці. Універсалізм хрысціянства засноўваецца на здольнасці дадзенай рэлігіі да асіміляцыі розных культурных каштоўнасцей. У працэсе свайго распаўсюджвання хрысціянства рабілася аб'яднальным духоўным пачаткам, а разам з тым і асновай дзяржаўнасці для шматлікіх народаў. Дадзены фактар спрыяў узнікненню і развіццю ў багаслоўскай думцы, асабліва ў Візантыі, ідэі «Царквы-народа», дзе царкоўны арганізм, грамадства і дзяржава ўяўляюць сабой адзінае цэлае. Зараз ідэя «Царквы-народа», «Царквы-нацыі» папулярызуецца некаторымі багасловамі і леварадыкальнымі грамадскімі дзеячамі з мэтай выкарыстання рэлігійных ідэй у палітычных мэтах.

Ва ўмовах Беларусі, дзе спецыфіка рэлігійнай сітуацыі вызначаецца яе геапалітычным становішчам на сутыкненні заходняй і ўсходняй цывілізацый, пачарговым дамінаваннем у гісторыі праваслаўя і каталіцызму, поліканфесіянальнасцю і поліэтнічнасцю, распаўсюджванне ідэі «Царквы-народа» можа прывесці да расколу грамадства па нацыянальна-рэлігійнай прыкмеце. Для айчыннай даследчай літаратуры адной з актуальных тэм з'яўляецца вывучэнне спецыфікі развіцця канфесіянальных і нацыянальных адносін, якія склаліся на беларускай зямлі [1]. Адным з аспектаў дадзенай праблематыкі, які пакуль не атрымаў належнага разгляду ў навуковай літаратуры, з'яўляецца даследаванне суадносін хрысціянскага універсалізму і нацыянальнага самавызначэння ў святле сучасных сацыяльных вучэнняў РПЦ і РКЦ. Вывучэнне дадзенага аспекту з'яўляецца мэтазгодным для дыягнаставання і прагназіравання ўзаемадзеяння царквы і дзяржавы, што спрыяе выпрацоўцы аптымальнай мадэлі дзяржаўна-царкоўных і міжканфесіянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь. Падчас дадзенага даследавання мы паспрабуем выявіць суаднясенне хрысціянскіх каштоўнасцей і нацыянальнай самасвядомасці ў сацыяльных канцэпцыях каталіцызму і праваслаўя. Даследаванне будзе абапірацца на сучасныя дакументы сацыяльных вучэнняў, а менавіта: «Асновы сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай Царквы», зацверджаныя на Юбілейным Архірэйскім саборы 2000 г., дакументы II Ватыканскага сабора (1962–1965), на сацыяльныя энцыклікі Яна Паўла II «Клопат аб сацыяльным пытанні» (1987) і «Соты год» (1991).

Адной з характэрных рыс сучасных сацыяльных вучэнняў каталіцтва і праваслаўя з'яўляецца універсальнае разуменне хрысціянства, дзе царква мае наднацыянальны характар, а ўсе хрысціяне з'яўляюцца людзьмі адзінай хрысціянскай супольнасці, званага народам Божым [2, с. 43; 3, с. 105, с. 570]. «Адзінства гэтага новага народа забяспечваецца не нацыянальнай, культурнай або моўнай супольнасцю, але верай у Хрыста і Хрышчэннем» [2, с. 43]. Універсалізм хрысціянства не супрацьпастаўляецца магчымасці нацыянальнага самавыяўлення. Першапачаткова хрысціянства прымалі людзі, якія адносіліся да розных народаў, да розных культурных тыпаў. Веравучэнне праваслаўя і каталіцтва засноўваецца на Святым пісанні і Святым паданні. Як адзначае прафесар Маскоўскай Духоўнай Акадэміі дыякан А. Кураеў, калі Святое пісанне застаецца нязменным і адзіным для ўсіх хрысціян, то Св. паданне мае характар гістарычнага ўвасаблення і «носіць сляды мясцо-

вых нацыянальных культурных умоў» [4, с. 115]. Гістарычнае паданне хрысціянства незвычайна багатае, але яго духоўная (чалавечая, экзістэнцыяльная) каштоўнасць вызначаецца першым чынам тым, што само паданне ёсць вынік не безасабовага, «абстрактнага», а менавіта асабістага і міжасобаснага досведу. Усё сапраўдна значнае ў паданні – персаніфікаванае, з'яўляецца вынікам раскрыцця дабравесця Хрыста і рэалізацыі сваіх духоўных дароў пэўнымі людзьмі, якія з'яўляліся прадстаўнікамі розных народаў. Раскрыццё тэафаніі і формы яе ажыццяўлення чалавекам адрозніваюцца па змесце і ступені, на іх накладваюць свой адбітак нацыянальныя асаблівасці. Працэс распаўсюджвання хрысціянства адбываўся дзякуючы здольнасці дадзенай рэлігіі да інкультурацыі. У праваслаўі ў рамках адной канфесіі існуе 15 Аўтакефальных Памесных цэркваў, якія пры супольнасці дагматычнага веравучэння адрозніваюцца адна ад адной асаблівасцямі культу, багаслоўскай тэорыі і духоўнай (падзвіжніцкай) практыкі. Варта таксама адзначыць, што першапачатковая разнастайнасць літургічных форм і кірункаў у багаслоўскай думцы вельмі хутка стала крыніцай напружанасці і канфліктаў у хрысціянстве, паўстала праблема захавання адзінай сутнасці хрысціянскага вучэння ў разнастайных у культурным дачыненні суполках. Аб гэтым сведчаць спрэчкі паміж апосталамі Пятром, Паўлам і Якавам, адасабленне Асірыйскай Царквы Усходу, а таксама Армянскай, Сіра-Якавіцкай Эфіопскай, Малабарскай і Копцкай цэркваў пасля III і IV Сусветных сабораў у Efece (431 г.) і Халкідоне (451 г.). Менавіта адрозненні ў культурнай асіміляцыі хрысціянства на Захадзе і Усходзе ў спалучэнні «з прынцыповым адрозненнем гістарычнага развіцця», па меркаванні прафесара Папскага Усходняга інстытута ў Рыме Вільгельма дэ Фрыса, прывялі да проціпастаўлення «грэцкага Праваслаўя і лацінскага Каталіцтва» і трагічнаму разрыву паміж імі [5, с. 10].

Бясспрэчным з'яўляецца прызнанне канструктыўнага ўплыву хрысціянізацыі на фарміраванне нацыянальнай культуры розных народаў. Варта таксама ўлічваць, што працэс распаўсюджвання хрысціянства адбываўся праз асіміляцыю хрысціянскага веравучэння з рознымі этнічнымі культурамі. Каталіцкі багаслоў Ч. Бартнік лічыць, што ўзаемаадносіны хрысціянскай царквы і народа з'яўляюцца працэсам узаемнага ўздзеяння [6, s. 31]. Царква, якая выконвае пастарскую функцыю, з'яўляецца для народа своеасаблівым каталізатарам працэсу самавыхавання і самаўдасканалення. Любы народ, нацыя таксама ўзбагачаюць царкву сваімі знакамітымі асобамі, спецыфічнымі рысамі менталітэту, этнасу, ідэяй культуры, звычаямі, традыцыямі, сваімі недахопамі і вартасцямі, сваёй гісторыяй, якая ўпісваецца ў гісторыю Сусветнай царквы.

Хрысціянскі універсалізм не адмаўляе нацыянальнага самавызначэння, а падпарадкоўвае нацыянальны пачатак сусветнаму. Рэалізацыя сусветнага ідэалу царквой павінна здзяйсняцца без адмаўлення нацыянальных адрозненняў, праз дакрананне да нацыянальнай культуры, да побыту розных пластоў насельніцтва. Кіраўнік папскай Рады па дыялогу з няверуючымі монсеньёр П. Пупар адзначае, што «адзінства Царквы здзяйсняецца не праз уніфікацыю і не праз скарачэнне яе памераў, але ва ўзаемадалучанасці» [7, с. 71]. Умовай усякага пастырскага служэння з'яўляецца выразнае ўяўленне аб разнастайнасці культуры і глыбокае веданне яе, якое неабходна для таго, каб спасцігнуць яе знутры. У пастырскай канстытуцыі II Ватыканскага сабора падкрэсліваецца, што «адна справа – залог сапраўднай веры, якая змяшчаецца ў нашым праўдзівым вучэнні, іншае – спосаб, якім гэтыя ісціны выяўляюцца, пры поўным захаванні таго жа сэнсу і значэння» [3, с. 590]. Падобнае меркаванне характэрна і для сучаснага сацыяльнага вучэння РПЦ, дзе адзначаецца, што «слоўная і вобразная мова дабравесця, яго метады і сродкі натуральна змяняюцца з ходам гісторыі, адрозніваюцца ў залежнасці ад нацыянальнага і іншага кантэксту» [2, с. 143]. Зыходзячы з гэтых дакументаў, можна зрабіць адназначную выснову, што ні адзін народ не можа прэтэндаваць на выключнасць у захаванні і перадачы дабравесця. Паўната дабравесця ажыццяўляецца не праз уніфікацыю хрысціянства, а праз прызнанне разнастайнасці яго форм пры адначасовым захаванні праўдзівасці веравучэння, праз захаванне вызначанага складу светаадчування, сістэмы думкі. На жаль, у гісторыі хрысціянства не заўсёды прысутнічала ўсведамленне прынцыпу хрысціянскага універсалізму, што часта прыводзіла да дагматызацыі абраду і, як следства – да царкоўных расколаў, няўдалых спроб аднаўлення адзінства (уній) шляхам дамінавання адной царквы над іншай.

Адным з аспектаў праблематыкі суадносін хрысціянскага універсалізму і нацыянальнага самавызначэння з'яўляецца асэнсаванне ідэі месіянізму з пазіцыі хрысціянскага веравучэння. Гэта ідэя была і з'яўляецца папулярнай у шматлікіх краінах, яна можа набываць як рэлігійны, так і палітычны характар. Ідэя месіянізму ў славян, як лічыць сучасны польскі гісторык Ц. Каліта, звязана з асэнсаваннем сваёй місіі ў гісторыі чалавецтва, якую ім яшчэ трэба будзе выканаць [8, с. 297–298]. У еўрапейскіх народаў, дзе распаўсюдзілася праваслаўе, дадзеная ідэя набывае рэлігійны характар у адрозненне ад народаў, дзе распаўсюдзілася каталіцтва. Напрыклад, ідэя месіянізму характэрна таксама

для палякаў. Яна прасочваецца ў працах польскіх крытыкаў (К. Брадзінскага, М. Махнацкага), у творчасці пісьменнікаў і паэтаў (З. Жэромскага, А. Міцкевіча, З. Красінскага, Ю. Славацкага, Ц. Норвіда), а таксама філосафаў (А. Цяшкоўскага, Ф. Канчатковага і інш.). Але тут дамінуючымі з'яўляюцца палітычныя моманты, праз якія паказваецца выключная роля польскага народа ў гісторыі Еўропы, а не польскага каталіцызму. Варта адзначыць, што ў каталіцкім багаслоўі факт універсальнасці хрысціянства з'яўляецца асэнсаваным, таму сцвярджэнні, паводле якіх нямецкі каталіцызм лепш за французскі або польскі і г. д., насілі эпізадычны характар. Праваслаўным цэрквам уласціва традыцыя «нацыянальнага» ўспрымання хрысціянства, калі рускае, грэчаскае, сербскае або балгарскае праваслаўе абвяшчаецца адзіным «праўдзівым», і менавіта яму прыпісваецца выключная місія сярод іншых народаў. Актуалізацыя ідэі рэлігійнага эксклюзівізму адбываецца дзякуючы экстрапаляцыі старазапаветнага вучэння аб богаабранасці ізраільскага народа на вызначаную аўтакефальную царкву. У рускай багаслоўскай традыцыі дадзеная ідэя часта выкарыстоўваецца пры абароне артадаксальнасці рускага праваслаўя ў адрозненне ад візантыйскага, якое не захавала праўдзівасці веры, а таксама пры абгрунтаванні рэлігійна-палітычнага характару ідэі «Масква – трэці Рым, чацвёртаму не бываць» [9, с. 78–79]. Варта адзначыць, што ідэя месіянізму, як адна з характэрных для рускай рэлігійна-філасофскай думкі, прасочваецца таксама ў працах Ф. Дастаеўскага, У. Салаўёва, А. Хамякова, Н. Бярдзяева, У. Разанава, Н. Фёдарава, Г. Фядотава, М. Скабцовай, што сведчыць аб унутранай згуртаванасці праваслаўя з рускай ідэяй культуры і дзяржаўнасці.

У хрысціянскім сацыяльным вучэнні (яшчэ з часоў св. Аўгусціна), традыцыйным з'яўляецца ўспрыманне народа як духоўнай супольнасці. Народ, нацыя, як і кожная асоба, удзельнічаючы ў Боскай сатэрыялагічнай і эсхаталагічнай эканоміі, мае сваё прызначэнне. Пасродкам выканання гэтай місіі нацыянальны пачатак прылучаецца да сусветнага пачатку. З пункту гледжання хрысціянства праз ўсведамленне гэтай місіі і складаецца тая праўдзівая нацыянальная самасвядомасць. Не існуе нейкай вызначанай, усталяванай Богам іерархіі паміж народамі, паколькі кожны з іх мае сваё прызначэнне ў гісторыі чалавецтва. Аб хрысціянстве народа сведчаць не дэталёва распрацаваныя тэалагумены (асабістыя багаслоўскія меркаванні) тых ці іншых аўтараў, але яго менталітэт, «хрысціянскі behaviour», гэта значыць, наколькі народ думае і паводзіць сябе, калі прытрымваецца хрысціянскіх прынцыпаў. Таму месіянізм з яго этнаэксклюзівізмам і ізаляцыянізмам зусім не супадае з хрысціянскім месіянізмам, з усведамленнем народам сваёй місіі ў гісторыі чалавецтва, прынцыпы якога не супярэчаць веравучэнню. Усведамленне народам, нацыяй сваёй місіі можа перараджацца ў этнаэксклюзівізм, калі гістарычнае прызначэнне нацыі ўяўляецца тоесным справе выратавання ўсяго чалавецтва. У такім разе нацыянальная свядомасць набывае рысы месіянізму або больш вытанчанага экстрэмісцкага нацыяналізму. Папулярызацыя ідэі рэлігійнага месіянізму ў багаслоўі, роўна як і паданне падобных асабістых тэалагуменаў у выглядзе афіцыйнага вучэння царквы, азначае сур'ёзнае скажэнне сутнасных асноў хрысціянскага веравучэння і спрыяе палітычнай інструменталізацыі рэлігіі. Ідэя месіянізму, па меркаванні нямецкага філосафа А. Ігнатава, у сучасным грамадстве актыўна выкарыстоўваецца палітыкамі, для ўтойвання «пад псеўдарэлігійнай маскай» нацыяналізму і шавінізму [10, с. 25–26]. Улічваючы актуалізацыю месіяніцкіх поглядаў як у палітыцы, так і багаслоўі, у саборных дакументах РПЦ заяўляецца, што «праваслаўнай этыцы супярэчыць дзяленне народаў на лепшыя і горшыя, прыніжэнне якой-небудзь этнічнай або грамадзянскай нацыі» [2, с. 46]. Падобная пазіцыя характэрна і для РКЦ. У пастырскай канстытуцыі II Ватыканскага сабора падкрэсліваецца, што «кожная галіна чалавечай супольнасці нясе ў сабе, у сваіх здаровых традыцыях вызначаную частку духоўнага багацця», таму ў Боскай эканоміі не вылучаюцца вышэйшыя і ніжэйшыя народы [3, с. 615]. Народ як культурная супольнасць адыгрывае істотную ролю ў фарміраванні чалавека і ў яго самаідэнтыфікацыі. Таму зневажанне любога народа як формы і арганізацыі супольнасцей першаснага ўзроўню з'яўляецца парушэннем правоў чалавека. Рымскі Папа Ян Павел II у сваіх сацыяльных энцыкліках «Клопат аб сацыяльнай рэчаіснасці» і «Соты год» указваў на неабходнасць усведамлення ва ўмовах сучаснага свету не толькі правоў асобы і сям'і, але і правоў народа. Да спрадвечных правоў народа Папа адносіў права на культурную самастойнасць і самабытнасць, захаванне культурнай спадчыны, а таксама права на суверэнітэт, гэта значыць права на палітычную незалежнасць, на адказнасць за свой лёс [11, с. 44; 12, с. 29].

Праводзячы кампаратыўны аналіз сацыяльных вучэнняў праваслаўя і каталіцызму, можна зрабіць выснову, што асновай для іх з'яўляецца прынцып хрысціянскага універсалізму, які не супярэчыць нацыянальнаму самавызначэнню і самасвядомасці. Праблемным з'яўляецца для некаторых багасловаў асэнсаванне суадносін паміж догматам і абрадам, паміж самім благавесцем і яго ўвасабленнем у керыгматычным багаслоўі, паміж усведамленнем місіі асобнага народа, нацыі ў гісторыі чалавецтва і ідэяй месіяніз-

му. У сацыяльных дакументах абедзвюх цэркваў, з аднаго боку, прызнаецца магчымасць нацыянальнай самасвядомасці і самавызначэння, а з іншага – падкрэсліваецца неабходнасць усведамлення народам або нацыяй сваёй місіі ў рэалізацыі сусветнага ідэалу.

*Літаратура*

1. Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы Междун. науч. конф., 8–9 дек. 2005., г. Гродно / отв. ред. проф. М.А. Можейко. – Гродно: ГрГУ, 2006. – 40 с.
2. Основы социальной концепции Русской Православной Церкви: принята на Юбилейном Архиерейском соборе РПЦ 13–16 авг. 2000 г. – М.: Изд. Московской патриархии, 2000. – 160 с.
3. Sobor Watykanski II. Konstytucje. Dekrety. Deklaracje / Pod. red. Bp. J. Groblicki– Poznan: Pallottinum, 1992. – 426 s.
4. *Кураев, А.* Догмат и ересь в христианском предании / А. Кураев // Вопросы философии. – 1994. – № 9. – С. 104–131.
5. *Фрис, В.* Православие и католичество. Противоположность или взаимодополнение? / В. Фрис. – Брюссель: Жизнь с Богом, 1992. – 158 с.
6. Polska Teologia narodu / Cz.Bartnik [i in.]; pod red. Cz. Bartnika. – Lublin: KUL, 1986. – 348 s.
7. *Пупар, П.* Церковь и культура / П. Пупар. – Милан; М.: Христианская Россия, 1993. – 256 с.
8. Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы: материалы V Междунар. науч. конф., Гомель, 24–25 мая 2007 г. / М-во образования РБ [и др.]; под общ. ред. В.В. Кириенко. – Гомель: ГГТУ им. П.О. Сухого, 2007. – 358с.
9. Церковь и государство: сб. ст. / под. общ. ред. епископа Анадырского и Чукотского Диомида. – Православное общество «Панагия», Пермь; Православно-просветительский центр «Пересвет». – М., 2003. – 80 с.
10. *Игнатов, А.* Богословские аргументы в политической борьбе / А. Игнатов // Вопросы философии. – 1997. – № 5. – С. 15–30.
11. Jan Pawel II, Encyklika Sollicitudo rei socialis / Jan Pawel II. – Watykan, 1986. – 64 s.
12. Jan Pawel II, Encyklika Centesimus Annus / Jan Pawel II. – Watykan, 1991. – 80 s.

*Summary*

*One of the distinguishing characteristic of social studies of Catholicism and Orthodoxy is a universal comprehension of Christianity, where the church has a supranational nature, and all the Christians are the members of the unified Christian community. Christian universalism doesn't reject a national self-determination, but it subjects national principle to ecumenical one. The realization of the ecumenical ideal in the church should be performed without rejecting of national differences, through the complicity to a national culture. At the same time it is emphasized in the social documents of both churches that a nation's recognition of its mission in the realization of the ecumenical ideal shouldn't regenerate into ethnoexlusivism and chauvinism.*